# Фарбы, шчасце, каляровыя дні...

**З праектам «Каляровыя дні» — гэта карціны Ірыны Ясюкайць-Дударавай і Таццяны Грыневіч, якія пазіцыянуюць сябе мастачкамі з блізкімі светапоглядамі і вытанчаным успрыманнем рэчаіснасці, можна пазнаёміцца ў галерэі «Панарама», што ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі**



«Архідэі»



«Букет»



Таццяна Грыневіч

## На хвалях радасці

Дастаткова толькі набыць танныя білеты на аглядальную пляцоўку бібліятэкі і на прыгожым панарамным ліфце фінскай фірмы «KONE», які мае празрыстую шкляную прызматычную сценку, падняцца на 22-і паверх. А гэта, дарэчы, ні многа, ні мала — аж 73 метры над зямлёй. Пакуль будзеш на ім рухацца, то абавязкова атрымаеш адчуванне палёту. І з гэтай хвалюючай вышыні воку адкрываецца цудоўная панарама Мінска. Дарэчы, выгадная ландшафтная прапіска бібліятэкі робіць аглядальную пляцоўку прыцягальнай для турыстаў, якія могуць пазнаёміцца з Мінскам з вышыні.

З гэтым жа ўзнёслым адчуваннем і уваходзілі мы ў галерэю, калі адкрылася выстава маіх гераінь. Пэўна, калі б нават давялося ехаць сюды у звычайным ліфце, а потым заходзіць у галерэю без адчування палёту, у гэты стан абявязкова б паглыбіўся. Якім чынам? Ды ўсё проста. Бо ў карцінах абедзвюх мастачак столькі пазітыўнай энергіі, столькі чысціні, дабрыні, што міжволі пачынаеш адчуваць душэўную прыўзнятасць.

У экспазіцыі прадстаўлены работы, створаныя мастачкамі ў апошнія гады. Як лічаць мае субяседніцы, жывапіс — гэта ўніверсальная мова. Яе зразумее чалавек любой нацыянальнасці. Чаму? Як на мой погляд, то ўсё вытлумачальна: мы, нешта ўгледзеўшы, пачынаем тое хутка адчуваць. Спрацоўвае, як гавораць фізікі, закон вібрацый… Але спачатку меркаванні саміх мастачак. Давайце пазнаёмімся.

Гаворыць Ірына Ясюкайць-Дударава: «Наша выстаўка называецца «Каляровыя дні». Чым жа мы кіраваліся? Вядомым. Кожны дзень не падобны на другі. Гэта як калейдаскоп з каляровых шкельцаў. А настрой для працы можа быць каляровым фільтрам мінулага дня. Кожная мая карціна — гэта спроба спыніць час, гэта магчымасць паглядзець на свет праз уласнае акно душы».

А вось якімі думкамі дзеліцца Таццяна Грыневіч: «З Ірай выстаўляемся не першы раз. Выстаўка наша — гэта аповед аб прыгажосці імгнення. У сваіх карцінах я выказваю гаму пачуццяў і эмоцый, якія выклікаюць у мяне тыя ці іншыя вобразы. Наогул, люблю жывапіс для сэрца, той, які натхняе, акрыляе. Што тычыцца работ Іры, то ў яе дзіўным чынам атрымліваецца ў статыцы перадаць стан і настрой моманту. Мне падабаецца стрыманая і вытанчаная прыгажосць яе карцін. Калі гляджу на іх, чую мелодыі мне сугучныя, яны кранаюць сэрца. Таму мы разам…»

Мастацтвазнаўцы адзначаюць: як у паэзіі і музыцы, у жывапісе вобразы ствараюцца з дапамогай метафар, розных асацыяцый, рытмаў. Карціны мастачак пераклікаюцца ў тэмах, але яны розныя ва ўспрыманні. І кожная з іх — гэта маленькі сусвет, які змяшчаецца на чатырохкутніку звычайнага палатна, які пранізаны святлом і напоўнены адчуваннем шчасця быцця.

І сапраўды так. Асабіста мяне экспазіцыя вельмі ўразіла, і ад карцін, з якімі знаёмлю чытача, не хацелася адыходзіць: столькі ў іх сонца, радасці і хваласпеваў Таму, хто стварыў нас і падарыў магчымасць адчуваць гэтае шчасце і жыццё наогул.



«Рух да мары»



Ірына Ясюкайць-Дударава

***Творчасць Ірыны і Таццяны вядома не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Мастачкі актыўна ўдзельнічаюць у рэспубліканскіх і міжнародных выстаўках, іх карціны можна ўбачыць у Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў Беларусі, прыватных калекцыях Беларусі, Германіі, Італіі ды іншых краін.***



«Музыка ветру»

## Пабачу — паверу, сказаў чалавек. Паверыш — пабачыш, сказаў Сусвет…

Чамусьці гэты выраз, які належыць невядомаму аўтару, мне заўсёды прыгадваецца, калі сустракаюся с Ірынай. Яе даўно ведаю, з таго часу, як закончыла яна Акадэмію мастацтваў у 2009-м. Дарэчы, разам з Таццянай яны перш чым туды паступіць, вучыліся ў Мінскім мастацкім вучылішчы імя А. К. Глебава. Ірына — чалавек абаяльны, спакойны, разважлівы, нават стрыманы. Яшчэ яна, як мне падаецца, з асобаў з багатым унутраным светам, менавіта з тых, пра якіх гавораць: нешта бачаць… А дакладней, Ірына, мяркую, адчувае тонкія рухі жыцця, на якія далёкія ад мастацтва людзі не звяртаюць увагі. Яна верыць у Творцу ўсяго існага, у Хрыста, верыць у прыгажосць жыцця. Таму й здольная адлюстраваць з добрым густам на палатне тое, што адчувае ды бачыць унутраным зрокам. Дарэчы, Ірына працуе мастаком ў Свята-Елісавецінскім жаночым манастыры, і ў яе двое дзяцей-школьнікаў, дачка Яна й сын Арсеній. А муж Максім Дудараў таксама мастак. Так і хочацца яшчэ сказаць пра Ірыну: тая, што верыць і выпраменьвае… Таму ад карцін яе светла на душы. Я стаяла і стаяла ля працы «Суквецці. Скокі» ды каля іншых, і здавалася: яшчэ імгненне — і я ўздымуся над падлогай і ўслед за дзяўчынкамі на палатне палячу ў свет харавства, любові ды бясконцай радасці быцця.

Гэтыя адчуванні падштурхнулі да развагаў. Падчас любавання іншымі яе карцінамі думкі панеслі ў школьнае мінулае, на ўрокі фізікі. Прыгадаліся яе грунтоўныя асновы: закон пастаяннай змены энергій, закон прыцягнення, закон вібрацый, закон рытма …Магчыма, я іх цяпер не дакладна называю, але і дагэтуль добра памятаю, як наш настаўнік па фізіцы гаварыў: энергія нікуды не знікае ды ні з чаго не з'яўляецца, яна пераходзіць з адной формы ў другую…

Так і ёсць. І ўжо нікога не здзіўляе, калі мы гаворым: усё жыццё, прырода пабудаваны — на рытмах. І ўсё ў свеце створана з энергій, што рухаюцца пастаянна. У кожнай — свая частата, альбо вібрацыя. Прыгадаем інфракраснае выпраменьванне, калі сядзіш ля вогнішча, якое згасае. Працягнеш руку да вугалля — адчуеш рух цяпла ад іх. Гэта, кажуць навукоўцы, нізкія частоты. А самай высокачастотнай формай вібрацыі, сцвярджаюць вучоныя, з'яўляецца думка. І, зразумела: тое, што мы ствараем, а мастак малюе, вынік нашых думак і пачуццяў. Таму і карціны маюць тыя вібрацыі, энергію, альбо іх яшчэ называюць хвалямі, якімі насычае іх аўтар. Вось такая гэта штука: фізіка квантавая. Я нават там, у галерэі, палезла ў інтэрнэт, знайшла пацвярджэнне сваім развагам. І вось якія з іх мне спадабаліся.

Вучоныя многіх краін прыйшлі да высновы, што энергія думак большасці людзей, скіраваная да адзінай мэты, аб'ядноўваецца ў энергаінфармацыйнае поле. А затым на Зямлі, у грамадстве, у навакольным свеце адбываецца тое, што створана ў думках большасці людзей. Спрадвеку было вядома, што ў думкі закладзена каласальная сіла, здольная непасрэдна тварыць або разбураць. Дастаткова прыгадаць афарыстычныя выказванні кшталту: «На пачатку было слова…», «Якія думкі чалавека, такі ён сам…» Ужо даўно вядома: чалавечая думка матэрыяльная. Яна — згустак энергіі. Гэта даказалі акадэмік Расійскай Акадэміі навук Анатоль Ахатрын, амерыканскі доктар Тойч ды іншыя. «Мозг чалавека непасрэдна ўплывае на рэчаіснасць. Думка чалавека, яго свядомасць — гэта энергія ў найтонкай форме» — такія адкрыцці былі апублікаваныя дэканам Прынстан-

скага ўніверсітэта Р. Дж. Джанам і яго памочнікамі. Заснавальнік хвалевай генетыкі Пётр Гараеў сцвярджае, што людзі нават могуць уздзейнічаць сваёй думкай, словам, пачуццём на малекулы ДНК як уласныя, так і іншых людзей.

Любое прамоўленае альбо прачытанае слова — гэта хвалевая генетычная праграма, якая можа змяніць наша жыццё ды жыццё іншых людзей. Чалавечая думка здольная стварыць для малекулы ДНК, якая ляжыць у аснове ўсяго жыцця на Зямлі, любую праграму (https://galaktika.mirtesen.ru/). Але пакінем тое навукоўцам-даследчыкам. Мы ўсё ж не прывыклі ў жыцці карыстацца такімі тэрмінамі, як ваганні, часціцы з хвалямі, то будзем карыстацца агульнапрынятымі: такімі як, напрыклад, «інтуіцыя», «шостае пачуццё», «мастакоўская фантазія», «аўтарскае бачанне»…

Але, калі я спынілася каля прац Таццяны, зноў думкі круціліся вакол… квантаў. І ўжо чамусьці думалася пра кванты радасці. Мяркую, няма ў навуцы падобных тэрмінаў, дакладней казаць: хвалі. Тады, ведучы ўнутраны дыялог з самой сабой, стаяла ля яе работ — і адчувала гэтыя хвалі радасці. І што б вы думалі? Мяне захіснула неверагодная радасць ужо толькі ад адной Танінай усмешкі. І, безумоўна, ад яе «Архідэй».



«Вышэй»



«Сон у летні дзень»

А карціна «Рух да мары» — гэта ўжо філасофія, якую патлумачыла так: любы поспех у жыцці не падорыць табе радасці, калі няма з кім ім падзяліцца. Вось таму й рухаемся мы ў жыцці ў пошуку любові, кахання, сяброў… Натуральна, што кожны расчытае і ў працах Таццяны, як і Ірыны, нешта сваё.

З Таняй я знаёмая ў большасці па яе працах ды са слоў Іры. Таня выхоўвае дочак — Маю и Радхіку. Але гэта не стрымлівае яе ў творчасці, наадварот, гаворыць: часу хоць і менш на жывапіс, але дзеці дораць столькі эмоцый, што толькі і пісаць карціны. І, як і Ірына, робіць гэта выдатна.

Недзе я прачытала пра тое, што стыль жыцця — гэта ўменне знайсці час паслухаць цішыню, паназіраць заход сонца, гэта мастацтва быць там, дзе знаходзішся… А яшчэ гэта і пошукі ўнікальных магчымасцей пераўтвараць эмоцыі ў значныя жыццёвыя падзеі. І, як мне падаецца, у абедзвюх мастачак, якія імкнуцца стварыць свой унікальны, сказала б, рознакаляровы стыль жыцця, тое атрымліваецца.

Валянціна **Ждановіч**